**Новости института**

Обновлено 26.05.2021 16:21
Опубликовано 26.05.2021 16:19
Просмотров: 656

Кафедрай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін сярод курсантаў першага курса факультэта міліцыі былі праведзены прадметная алімпіяда і конкурс навуковых праектаў па дысцыпліне «Замежная мова».

Фармат мерапрыемства прадугледжваў камбінаваны ўдзел: папярэдне курсанты самастойна выконвалі заданні, дэманструючы веданне англійскай і нямецкай моў. Моўныя алімпіядныя заданні ўключалі ў сябе лексічны, граматычны і краіназнаўчы блокі. На другім этапе курсантам прапанавалі выбраць тэму для вуснага выступлення на замежнай мове і публічна выступіць пасля кароткай падрыхтоўкі. Таксама ў межах алімпіяды адбыўся конкурс навуковых праектаў, для якога курсанты падрыхтавалі электронныя прэзентацыі навукова-даследчых работ па дысцыпліне «Замежная мова».

Па выніках усіх этапаў алімпіяды журы былі вызначаны пераможцы. Лепшыя веды паказалі Ілля Мерзлякоў, Дзяніс Герасімаў, Вадзім Ржэўскі, Уладзіслаў Галаварушка, Данііл Лялека, Дар'я Жукава, Дзмітрый Багданаў, Дыяна Баркавец, Ангеліна Сарачанкова.

Падобныя інтэлектуальныя конкурсы сталі традыцыйнымі і праводзяцца штогод для першакурснікаў напярэдадні выніковага экзамену па дысцыпліне «Замежная мова». Таксама ў межах мерапрыемства адбылося ўзнагароджванне курсантаў – пераможцаў конкурсаў, арганізаваных кафедрай сацыяльна-гуманітарных дысцыплін: першага міжнароднага конкурсу навуковай інфаграфікі, інтэграванай алімпіяды па гісторыі, літаратурнага конкурсу "Некриминальное чтиво".

*Па інфармацыі кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.*



Phoca PDF